**Літаратура**

1. Марціновіч, А. Святло чароўнага ліхтарыка: выбраныя старонкі гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры: дапаможнік для педагогаў дашкольных установ: у 2 кн. — Мінск: Нар. асвета, 1997. — Кн. 1. — 176 с.

*Царэвіч Ю.Дз.*
*БГУКіМ, Мінск*

## КОННАЯ КАРУСЕЛЬ РАДЗІВІЛАЎ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

Адным з праблемных аспектаў духоўнай культуры Беларусі з'яўляецца стварэнне сучасных гарадскіх свят, пабудаваных перш за ўсё на мастацка-гістарычных традыцыях нашага народа. Аднымі з такіх традыцый з'яўляюцца паратэатральныя дзеі XVIII — XIX стст., якія слаба распрацаваны ў навуковай літаратуры.

«Конная карусель» — прыклад такіх паратэатральных дзей, якія займалі значнае месца ў духоўнай культуры шляхецтва, узбагачалі і папаўнялі скарбонку беларускіх традыцый.

У 18 ст. на тэрыторыю Беларусі на змену рыцарскім турнірам прыходзяць «конныя каруселі» — тэатралізаваныя касцюміраваныя конна-спартыўныя спаборніцтвы, якія праводзіліся як самастойныя дзеі, так і як часткі пэўных святочных падзей.

Распаўсюджанне «каруселі» ў Беларусі 18 ст. звязана з магнацкім родам Радзівілаў.

«Карусель»у сваёй структуры мела дзве часткі: 1-ая (антычная) — змаганне і 2-ая (сярэднявечная) — парадная; з антычнасці прыйшла гульня ў кольцы — надзяванне і зняцце дзідай падвешанага кальца, а з сярэднявечча — традыцыі рыцарскіх турніраў (асобныя паядынкі і агульны бой паміж дзвюма партыямі рыцараў). Гэтыя паядынкі знайшлі працяг у карусельных практыкаваннях. Парадная частка «каруселі» адлюстроўвалася на ўрачыстых маршах удзельнікаў са шматлікай світай да месца змагання, а затым да месца ўручэння падарункаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карусельныя дзеі на тэрыторыі Беларусі праводзіліся там, дзе размяшчаліся кадэцкія карпусы (Нясвіж, Гародня, Слуцк, Шклоў). На ўсходнеславянскіх землях першая карусель з'явілася пад уплывам заходнееўрапейскай культуры ў г. Нясвіжы ў 1724 г.

«Каруселі» ўключалі ў сябе вальтыжыроўку (адначасна з дэманстрацыяй адзення і розных каштоўнасцей), стральбу ў мішэнь вярхом на кані, паказ умення валодання пікай, шабляй і г.д. Па сутнасці яны выконвалі фігуры вышэйшай школы язды вярхом. Аднак трэба заўважыць, што ў XVII — XVIII стст. «школа» мела ярка выяўлены ваенна-прыкладны характар. Асаблівай папулярнасцю ў «каруселі» карысталіся камічныя конныя гульні. Для змагання ўдзельнікаў былі зроблены статуі, выробленыя з дрэва. У першай статуі на адной руцэ знаходзілася мішэнь, у якую трэба было папасці пікай, каб пазбегнуць удара скураным кіем, размешчаным ў другой руцэ. У другой статуі на грудзях быў жалезны круг, у які неабходна было папасці куляй, каб ракеты выляцелі уверх. Трэцяя статуя мела скрынку, пры пападанні ў якую з яе вылятали розныя птушкі. Чацвертая статуя аблівала вадой з губы нязграбнага ўдзельніка, калі той не пападаў лапаткай у мішэнь на грудзях [4].

Для правядзення «конных каруселяў» будавалі амфітэатры ці манежы. На спецыяльных «карусельных пляцоўках» майстравалі карэ: у сярэдзіне квадрата ўстанаўліваліся неабходныя прыстасаванні (кольца, бар'еры), а чатыры групы вершнікаў («банды», «кадрылі»), апранутыя ў розныя па характару і колеру касцюмы, пачыналі змаганні.

У структуру конных каруселяў уваходзілі:

- Парад усіх удзельнікаў — аб'езд некалькі кругоў на конях;
- Фігурная кадрыль — дэманстрацыя верхавой язды групамі;
- Дэманстрацыя элементаў выяздкі і дрэсуры коней;
- Змаганні ўдзельнікаў у „коннай каруселі";
- У гульнях мелі магчымасць прымаць удзел і гледачы [3, с. 95].
- Маляўнічасць відовішча, пышнасць гарнітураў удзельнікаў таксама лёгка тлумачыцца, бо ў «каруселі» змагалася вышэйшая шляхта і нават магнаты. Багатае адзенне, каштоўныя камяні, залатыя і срэбныя ўборы кавалераў і коней павінны былі прадэманстраваць магутнасць і пышнасць шляхты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сённяшні дзень традыцыі правядзення «каруселі» на Беларусі не існуе. Захаваліся толькі некаторыя элементы гэтай дзеі, якія набылі статус асобнага віду коннага спорту: верхавая язда і дрэсура коней. Нягледзячы на тое, што кожны год у Беларусі праводзяцца рыцарскія фестывалі, нажаль, на іх не існуе «коннай каруселі».

Пры ўзнаўленні «коннай каруселі» і магчымасці яе ўключэння ў сфарміраваную за шмат год структуру сучасных фестываляў сярэднявечнай культуры рыцарскія дзеі дадуць новае жыццё даўняй беларускай традыцыі.

У мэтах удасканальвання сучасных свят сярэднявечных культур я прапаную наступнае:

- СШ праводзіць спартыўныя мерапрыемствы аддаючы перавагу традыцыйным гульням беларусаў, стварыць секцыі па фізічнаму выхаванню юнакоў і дзяўчат на аснове традыцыйнага баявога мастацтва беларусаў;
- ВНУ ўвесці курс лекцый па вывучэнню гісторыі традыцыйных баявых і спартыўных адзінаборстваў беларусаў, праводзіць бяседы са знаўцамі традыцыйных баявых і спартыўных адзінаборстваў беларусаў;
- ва установах культуры і мастацтва ў пэўныя святы ўключыць правядзенне «конных каруселяў» як частку святочнай падзеі.

Я лічу, што пры выкананні гэтых прапаноў нашыя святы заззяюць сваім першародным бляскам, узбагацяць сучасную святочную культуру беларусаў.

**Літаратура**


1. Барышев, Г.И. Театральная культура Белоруссии 18 в./Г.И. Барышев.— Мінск: Навука і тэхніка, 1992.– 293 с.: ил.
2. Грицкевич, А.П. Частновладельческие города Беларуси в 16—18 вв. (социально-экономическое исследование истории городов)/А.П. Грицкевич — Мінск: Наука и техника, 1975.— 111 с.
3. Гуд, П.А. Мастацтва феерверкаў/П.А. Гуд.— Мінск: ООО „Мэджик Бук“, 2007.— 100 с., іл.
4. Дыяруш князя Міхаіла Казіміра Радзівіла, ваяводы віленскага, гетмана ВКЛ/Спадчына, 1994 № 4. Там жа 1995 № 3.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў/А. Мальдзіс. — Мінск: Маст. літ., 1982—256 с.
6. Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: успаміны, даследаванне гісторыі, звычаяў/У. Сырыкомля//Пер. з пол. мовы, прадм., камент. К. Цвіркі. — Мінск: Маст. літ., 2002. — 205 с.

*Цмыг Г.П.*
*ИИЭФ им.К.Крапивы НАНБ,*
*Минск*

# ХОРОВОЙ ТЕАТР: СПЕЦИФИКА И ВОЗМОЖНОСТИ. (К ПРОБЛЕМЕ ЖАНРОВОГО ФЕНОМЕНА)

Хоровой жанр музыкального искусства на протяжении всей своей истории функционировал в различных формах, что обусловлено предпосылками как социо-исторического происхождения, так и собственно стилевой парадигмой определенной «музыкальной цивилизации». Кроме того уникальность хоровой исполнительской практики как вида творческой деятельности определяется ее коллективным характером, связью с национальной певческой традицией (фольклорной и религиозной), а также и социально-эстетическими функциями. Все это является предпосылкой особой демократичности этого жанра музыкального искусства, способного к модификациям разного рода. Так, например, это и специфика хорового пения в древнегреческом искусстве *(драматический театр)*, и ведущая его роль в кантатно-ораториальных жанрах европейской академической традиции *(вокально-инструментальная музыка)*, и его различные функции в опере *(музыкально-тетаральные жанры)*, и т. д. Перечисленные особенности «жизни» хорового жанра в его связи с театром, а также и имманентно присущая некоторым его жанровым видам собственно музыкальная театральность (в свою очередь тесно связанная с феноменом музыкальной пространственности [1]), — послужили основой формирования такого явления в современном искусстве как *хоровой театр.* Целью данного доклада является разработка проблемного поля для исследования данного



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ